**Борсук Н.М.** (Брэст, Беларусь)

# МАЙСТЭРСТВА М. ГОРКАГА-ЖУРНАЛІСТА

У гісторыю культуры М. Горкі ўвайшоў не толькі як геніяльны празаік, але і як выдатны публіцыст, рэдактар, выдавец, журналіст. У артыкуле «Вместо предисловия» (1936) Аляксей Максімавіч гаварыў пра сябе як пра «старога газетчыка». М. Горкі з павагай ставіўся да працы журналіста, добра ведаў, колькі нерваў, энергіі патрабуе газетная справа, колькі часу яна адымае. Дакументальна пацверджана, што за час кіраўніцтва часопісам «Колхозник» Аляксей Максімавіч ухваліў і адрэдагаваў 197 рукапісаў; акрамя гэтага ён прачытаў, зрабіў крытычныя заўвагі і адмовіў у друкаванні аўтарам 97 матэрыялаў. Пасля смерці М. Горкага ў выдавецтве засталося столькі адрэдагаваных журналістам рукапісаў, што іх хапіла б на шэсць наступных нумароў часопіса.

М. Горкі актыўна далучаў пісьменнікаў да працы ў перыядычным друку, не падзяляў пазіцыі скептыкаў, якія выказвалі меркаванне, быццам супрацоўніцтва з газетамі і часопісамі «портит мысли, язык писателя» [4, 79]. Аляксею Максімавічу імпанавала пазіцыя К. Федзіна: «Газета не располагает писателя к халтуре, наоборот – искореняет неряшливость, многословие и вырабатывает самые дорогие качества, необходимые в художественной прозе: краткую форму, точность выражения, ясность мысли. В то же время живое слово писателя в газете заставляет подтягиваться и работников печати, исправлять бюрократический язык и стиль своих материалов. Работа в газете – это школа, заменить которую в литературе нечем» [6, 350].

Паводле М. Горкага, галоўнае прызначэнне прэсы – быць «на страже всего чистого и честного.., будить совесть общества». Газетчыкі ва ўяўленні пісьменніка – гэта людзі, што «расходуют для общества действительно горячую кровь сердца и неподдельный сок нервов» [1, 6]. Невыпадкова адзін з артыкулаў пачынаючага журналіста называўся «На арене борьбы за правду и добро» (“Самарская газета»). М. Горкі з захапленнем расказваў аб сваёй працы ў вышэйназваным выданні: «Но – газета! Я ею доволен, она не даёт спокойных дней здешней публике. Она – колется, как ёж. Хорошо! Хотя нужно бы, чтоб она колотила по пустым башкам, как молот» [1, 13]. Пісьменнік ратуе за стварэнне масавай прэсы, «до пустяковых мелочей быта внимательной к жизни рабочих и крестьян» [1, 54].

Па перакананні М. Горкага, газеты «Челноки», «Верстаки», «Молотилки», «Искры трамваев», якія выдавалі рабочыя фабрык, заводаў, трамвайных паркаў і г.д., – гэта яскравае сведчанне актыўнай працы вялікай арміі рабкораў, селькораў. У артыкуле «Десять лет» аўтар з гонарам паведамляе, што «народ учат и он учится свободно говорить о себе самом, о своих нуждах и желаниях», з радасцю канстатуе факт выдання ў Іркуцку часопіса «Буду-

щая Сибирь»: «Это – совершенно необходимое и своевременное дело, тем более своевременное, что оно несколько запоздало, как вообще у нас опаздывает родиться и развиваться областная литература» [1, 75]. Аляксей Максімавіч перакананы, што для жыхароў гарадоў і вёсак спецыялізаваныя часопісы і газеты стануць «таким зеркалом, которое покажет активному работнику революции и культуры его достижения во всех областях науки, техники, искусства, быта» [1, 60]. Так, літаратурна-мастацкі часопіс «Колхозник», «Крестьянская газета», мастацка-ілюстраванае выданне «На стройке МТС и совхозов» – гэта, бясспрэчна, выданні «для пользы і для отдыха» (паводле ацэнкі аднаго з калгаснікаў) вясковага жыхара [4, 291]. Задачу часопіса «Наши достижения» М. Горкі сфармуляваў у лісце да растоўскага нарысіста Максімава – «асвятленне паэзіі працы і творчасці не словамі, а фактамі» [4, 164]. Часопіс «Северное сияние» прызначаўся дзецям. Як бачна, кожная адзінка перыядычнага друку, што выдавалася пры непасрэдным удзеле М. Горкага, мела свой накірунак: «Журнал без направления – вещь нелепая, несуразная, скандальная и вредная» [2].

М. Горкі не значыўся афіцыйным рэдактарам «Колхозника», «Литературной учёбы», «Наших достижений», «За рубежом». Але ўсе гэтыя часопісы і газеты выходзілі пры непасрэдным удзеле пісьменніка. Ён быў паўнапраўным шэф-рэдактарам, які цалкам вызначаў змест і форму падачы матэрыялаў усіх пералічаных вышэй выданняў.

У публіцыстыцы М. Горкага значнае месца займаюць лісты-звароты да чытачоў, адказы на карэспандэнцыю. Па водгуках чытачоў выдавец вывяраў каштоўнасць, даходлівасць, цікавасць зместу часопісаў і газет. Рэдакцыя ўлічвала заўвагі, дасланыя ў выглядзе лістоў. Часам яна не чакала, покуль гэтыя матэрыялы прыйдуць самацёкам, а сама звярталася да чытача з просьбаю выказаць сваё ўражанне ад чарговага нумара часопіса, падказаць, што можна зрабіць для яго ўдасканалення. Для ўсіх горкаўскіх часопісаў характэрны анкеты-звароты да чытача. Прапануем узор анкеты рэдакцыі часопіса «За рубежом»:

– Достаточно ли понятен и лёгок язык журнала?

– Какие очерки и статьи в первом номере наиболее интересны? (Какие неинтересны и не нужны?)

– На какие вопросы желательно найти ответ в следующих номерах?

– Какие постоянные отделы желательны в журнале?

– Достаточно ли в номере иллюстраций?

– Что нравится больше: фотоснимки или рисунки-карикатуры? [4, 305].

М. Горкі ўважліва сачыў за падрыхтоўкай да выдання амаль кожнага нумара часопіса «За рубежом». Нават калі жыў у Сарэнта, ён выказваў прынцыповыя заўвагі супрацоўнікам выдання, патрабаваў ад іх уважліва вычытваць карэктуру, сачыць за якасцю шрыфту, надаваў належнае значэнне афармленню і г.д. Пісьменнік з павагаю ставіўся да працы друкароў. У сувязі з гэтым прапанаваў тэму для чарговага артыкула: «Нужна статья о достижениях в области типографского дела и быте печатников. Как работают наборщики, сколько миллиардов букв набрано ими за 10 лет и т.д.» [1, 165]. Ці не таму на старонках перыядычнага выдання «За рубежом» час ад часу з'яўляліся на першай паласе яскравыя загалоўкі-аншлагі, якія паведамлялі аб змесце асноўных артыкулаў, карэспандэнцый, аглядаў нумара; першая і апошняя старонкі выдання друкаваліся двума колерамі; М. Горкі падтрымаў прапанову М. Кальцова аб увядзенні слоўніка тэрмінаў, «Фотостраницы», новых раздзелаў – «Служба справок» (рубрыкі «Наш атлас» с картамі і «Памятные даты») і Бібліяграфія (мэта якога – рэцэнзаванне новых кніг, прысвечаных дасягненням

гаспадарчага і культурнага будаўніцтва, поспехам савецкай навукі; знаёмства чытача з творамі на тэмы, якія ўзнімаюцца на старонках часопіса).

Перапіска М. Горкага з чытачамі была цікавай і значнай, часам яна ператваралася ў палеміку па тым ці іншым пытанні. У дыскусіях ён знаходзіць станоўчыя моманты: у краіне паступова знікаюць «механические граждане», «люди живут открыв глаза», «автоматическое мышление – мышление по навыкам, внушённым старой школой, мещанским бытом, отмирает» [1, 63]. М. Горкаму заўжды было прыкра, калі даводзілася быць сведкам таго, «как яростно поливают оппоненты друг друга кипятком самолюбия». Ён не мог зразумець «этот странный и неуместный тон личного озлобления» [1, 66]. Адсюль яго ўпэўненасць, што «дело критики, публицистики – заняться именно… делом очеловечивания людей» [1, 65].

Мастацтву палемікі, бясспрэчна, можна навучыцца. У гэтым пераконвае і шлях М. Горкага-журналіста. Падчас працы ў «Самарской газете» Аляксей Максімавіч часам дазваляў сабе рэзкія выступленні, нават абразлівыя. Так, М. Горкаму надакучыў паэт з адпаведным тону яго вершаў прозвішчам Скукін. Журналіст з нейкай юнацкай гарэзлівасцю прыставіў да прозвішча «гора-паэта» слова сын. І ў друк пайшло – «Скукин сын». Атрымалася груба, развязна: «Каков этот г. Скукин, сын своего времени? Остроумный мальчик. Он «пачкать бумагу занятен». Пишет стихи и опасается, что его «пронесёт…» (и т.д.). Тон фельетона расчараваў В. Караленку, па рэкамендацыі якога М. Горкі працаваў у «Самарской газете». В. Караленка ў лісце нагадаў журналісту пра паважлівае стаўленне да карэспандэнтаў: «Не рассердитесь за маленький совет. Я пишу в газетах уже лет 10, в том числе приходилось много раз производить печатные атаки личного свойства. Я не помню случая, когда мне приходилось бы жалеть о напечатанном. Прежде чем отослать в редакцию, я всегда стараюсь представить себе, что человек, о котором я пишу, – стоит передо мною и я говорю ему в глаза то самое, что собираюсь напечатать. Если воображение подсказывает мне, что я охотно повторил бы все, даже, может быть, резче – я отсылаю рукопись. Если же, наоборот, чувствую, что в глаза кое-что хочется смягчить или выбросить, – я это делаю немедленно, потому что не следует в печати быть менее справедливым, осторожным и деликатным, чем в личных сношениях» [1, 35–36]. Гэтыя словы мудрага дарадца, пісьменніка М. Горкі запомніў на ўсё жыццё. Параду Уладзіміра Галактыёнавіча Караленкі карысна нагадаць і сучасным журналістам.

Спакойнае, пераканаўчае слова, нагляднасць, мова лічбаў, фактаў, дыяграм, карт, напісанне сатырычных вершаў, супрацоўніцтва з карыкатурыстамі, умелае выкарыстанне прынцыпу кантрасту – гэтыя сродкі, на думку М. Горкага, будуць мець значнае ўздзеянне на апанента [1, 103].

Дарэчы, М. Горкі асцярожна ставіцца да такога паняцця, як самакрытыка. «Дзелавая самакрытыка», лічыць журналіст, выдавец, спрыяе паспяховаму вырашэнню пастаўленых задач: «Она – необходима, «но не до истерики». Необходимо помнить, что её слушает вся молодёжь и не только слушает, а и усердно подражает резкости тона, и, усвоив тон старших товарищей, она вносит этот тон в свою среду, расправляется друг с другом недопустимо жестоко и, вызывая различные обиды, увеличивает этим количество мелких дрязг, густоту житейской пыли» [1, 58]. Бясспрэчна, даволі цяжка гарманічна аб'яднаць дзве сілы: дзейную і супрацьдзейную.

М. Горкі здолеў спалучыць у газетах і часопісах, выданнямі якіх ён кіраваў, творчы і крытычны пачаткі. Вырашэнню гэтай задачы спрыяла «Літаратурная старонка», што была створана ў многіх газетах і часопісах («Правда», «Известия» і інш.), а выданне «Колхозник» увогуле было задумана як літаратурна-мастацкае. М. Горкі з вялікай адказнасцю ставіўся да працы выдаўца. Ён не стамляўся паўтараць: «Главное – читатель. Моё мнение прислушиваться надобно к голосам снизу, а не сверху» [1, 258]. Па гэтай прычыне Аляксей Максімавіч забракаваў нарыс І. Эрэнбурга «Французская деревня». З пункту погляду выдаўца, аўтар недастаткова выразна паказаў палажэнне сялянства ў Францыі. Рукапіс паэмы А. Твардоўскага «Страна Муравия» М. Горкі прачытаў з цікавасцю, напісаў водгук, зрабіў праўкі, даў шэраг парад па дапрацоўцы і скарачэнні твора і вярнуў аўтару. Як успамінае работнік рэдакцыі П. Павленко: «Казалось бы хорошее произведение, а Горький говорит: нет, это сделано, а не рождено. И часто рукопись среднего писателя получала у него одобрение. Почему это? Потому, что заэтой рукописью чувствовалась душа, за которую можно было драться» [3, 17].

З задавальненнем прачытаў Аляксей Максімавіч рукапіс верша М. Ісакоўскага «Последний луч на горизонте тает» і адразу адправіў у набор, каб паспець у студзеньскі нумар «Колхозника» (1936) да гадавіны смерці У. Леніна. У часопісе верш быў надрукаваны пад назваю «У Мавзолея Ленина». Творы М. Ісакоўскага падабаліся М. Горкаму. Яны выдатна дапаўнялі празаічны матэрыял часопіса, узбагачалі яго. На большасці рукапісаў вершаў паэта стаяў лаканічны надпіс Аляксея Максімавіча: «Идёт». У 1936 годзе часопіс стаў друкаваць і песні з нотамі. Пачатак быў пакладзены вершам М. Ісакоўскага «Любушка», музыку да якога напісаў кампазітар І. Шышкоў. На старонках часопіса «Колзозник» чытачы маглі пазнаёміцца з вершамі Г. Гейнэ, Т. Шаўчэнкі, У. Маякоўскага, М. Някрасава, урыўкамі з паэмы Д. Байрана «Дон-Жуан», з «Слова аб палку Ігаравым», з прозай А. Чэхава, М. Ляскова і інш., з народнай творчасцю (казкі, песні – беларускія, дагестанскія, карэльскія і г.д.). Зарубежная класіка прадстаўлена апавяданнямі М. Твэна «Как я рэдактировал сельскохозяйственную газету» і інш. Як бачна з пераліку мастацкіх твораў, што былі прадстаўлены на старонках часопіса «Колхозник», М. Горкі мэтанакіравана праводзіў у жыццё асноўны прынцып перыядычнага выдання: «Он должен давать колхозам не крохи со стола богатого Лазаря, не интеллигентскую «милостыню внимания», а – по возможности – солидный литературный материал, который учил бы людей не только думать, но и правильно, точно излагать свои мысли, избегая болтовни» [1, 258].

М. Горкага задавальняў змест часопісаў і газет, форма падачы матэрыялу. У артыкуле «18-я годовщина пролетарской печати» [1, 69] журналіст прыводзіць багаты фактычны матэрыял, што сведчыць пра развіццё нацыянальнага друку, пра ўзросшую арганізуючую ролю прэсы, яе аператыўнасць: «Крестьянская газета» выдаецца тыражом у 1700000 экз. Калі ў 1913 г. у Расіі друкавалася ўсяго некалькі дзесяткаў выданняў, пераважна рэлігійнага зместу на 24 нацыянальных мовах, то ў 1928 годзе налічваецца 208 газет, звыш сотні часопісаў на 57 мовах. Тыраж газет у СССР павялічыўся болей чым у тры разы. Бясспрэчна, гэта не сухія лічбы.

Да гонару М. Горкага неабходна дадаць, што ён ніколі не ганяўся за сенсацыямі. Аляксей Максімавіч браў факты, звычайныя, будзённыя, тыповыя для рускай рэчаіснасці таго часу. «Учат факты! Факт – сильнее слова», – не стамляўся паўтараць рэдак-

тар і выдавец. Гэтым сцверджаннем ён узмацняў думку, што доўгія разважанні даволі часта робяць на чытача меншае ўздзеянне, чым яскрава пададзены факт. Адначасова пісьменнік пратэставаў супраць дробнага аналізу адмоўных з'яў нашага жыцця, па вобразнаму выразу М. Горкага, супраць «подчинения злому хаосу фактов». Факт журналіст параўноўваў з неабскубанай курыцай. У натуральным выглядзе яна непрыдатна для гатавання смачнай, спажыўнай стравы. Так і факт. Ён – «только сырьё, из которого следует извлечь, выплавить настоящую правду искусства. Нельзя жарить курицу вместе с перьями. Нужно научиться выщипывать несущественное оперение факта, нужно уметь извлекать из факта смысл» [5, 11]. Захапляемся ўменнем журналіста павярнуць факты новымі, нечаканымі гранямі, даць арыгінальныя, глыбокія абагульненні. М. Горкі неаднойчы быў сведкам таго, як параходы дастаўляюць з-за мяжы паперу ў самую багатую лясамі краіну. У такія хвіліны яго ахоплівала злосць, але ігнараваць дадзеным фактам журналіст не меў права. І тады ўмелым паваротам тэмы ён акцэнтуе ўвагу чытача на росце культуры ў краіне; на беражлівым стаўленні рускага чалавека да лясных багаццяў свайго краю.

М. Горкі выразна ўсведамляў, што забаронены плод заўжды спакушае людзей, асабліва моладзь. Па гэтай прычыне пісьменнік не бачыў неабходнасці ператвараць легальную літаратуру ў нелегальную. У сувязі з гэтым рэдакцыя часопіса «За рубежом» выдавала дадатак «Алфавитный указатель иностранной печати». М. Горкі таксама добра разумеў, што неапошняя роля ў працэсе фарміравання грамадскай думкі належыць буржуазнай прэсе: «Я нахожу, что читать буржуазную прессу так же полезно, как полезно слушать откровенные рассказы прислуги о жизни господ. Болезни не должны да и не могут интересовать здорового человека, но медик обязан изучать их. Между врачом и журналистом есть нечто общее: тот и другой устанавливают и характеризуют заболевания. Советский журналист должен бы относиться к показаниям буржуазной прессы так же внимательно, как врач относится к воплям и стонам больного» [1, 78]. Аляксей Максімавіч раіў супрацоўнікам часопіса набіраць артыкулы з замежнага друку светлым корпусам, а кароткія прынцыповыя заўвагі рэдакцыі – курсівам.

Пазнаёміўшыся з артыкуламі М. Горкага па праблемах друку, з успамінамі сучаснікаў пісьменніка, у якіх узгадваецца пра выдавецкую, журналісцкую дзейнасць Аляксея Максімавіча, прыходзім да высновы: М. Горкі быў надзіва працаздольным і ўдумлівым рэдактарам, «громадным рабкором», як называў яго А. Луначарскі. Ён бачыў і разумеў, што неабходна народу, што яго хвалюе і цікавіць. У творах публіцыста чытач знаходзіць водгук на важныя падзеі ўнутранага і міжнароднага жыцця. Усе пачынанні М. Горкага – гэта як бы падслуханыя і падгледжаныя запатрабаванні народных мас. Аляксей Максімавіч любіў «литературных младенцев», верыў у іх талент, нагадваў, што праца публіцыста – праца адказная, творчая і даваць нейкія рэцэпты пачаткоўцам немагчыма. Майстэрству М. Горкага-журналіста «навучыць нельга – можна толькі навучыцца» (паводле С. Эйзенштэйна).

## Литература

1. Горький, М. О печати / М. Горький. – М. : Госполитиздат, 1962.

2. Горький, М. Письмо в Гослитиздат / М. Горький // Известия. – 1929. – 29 мая.

3. Дроздов, А. Заметки о «Колхознике» / А. Дроздов // Лит. учёба. – 1936. – 31 декабря.

4. Пельт, В. М. Горький – журналист / В. Пельт. – М. : Изд-во политической лит-ры, 1968.

5. Прожогин В. М. Горький – как он писал, что думал и говорил о публицистике / В. Прожогин. – М. : Изд-во политической лит-ры, 1964.

6. Федин, К. Писатель, искусство, время / К. Федин. – М. : Сов. писатель, 1957.